# Беларусы ў еўрапейскай навуковай прасторы



фота: EZERIN PR

Еўрапейскі Саюз па-ранейшаму актыўна спрыяе ўдзелу беларускіх навукоўцаў у еўрапейскіх даследчых праграмах. Сёмая рамачная праграма ЕС (далей — 7РП) — гэта адзін з інструментаў, пры дапамозе якіх можна наладжваць супрацоўніцтва. У сувязі тым, што ў ліпені гэтага года быў распачаты апошні цыкл праграмы з запланаваных на перыяд з 2007 па 2013 год, у Прэзідыуме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 27 верасня адбыўся інфармацыйна-метадычны семінар «Магчымасці развіцця навуковай кар'еры і міжнароднай мабільнасці вучоных», арганізаваны Прадстаўніцтвам Еўрапейскага Саюза ў Беларусі, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Беларускім інстытутам сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы. На семінар былі запрошаныя патэнцыяльныя ўдзельнікі праграмы — маладыя навукоўцы з усёй Беларусі.

Падчас семінару былі прадэманстраваны магчымасці для супрацы ў сферы навукі і тэхналогій паміж Беларуссю і Еўрапейскім Саюзам. Галоўны акцэнт быў зроблены на праектна-арыентаваную міжнародную мабільнасць і ўдасканаленне навуковай кар'еры ў рамках праграм міжнароднага супрацоўніцтва, якія фінансуюцца ЕС. Таксама семінар закрануў актуальныя магчымасці ўласна 7РП і яшчэ адной буйной праграмы Еўрасаюза ў галіне акадэмічнай мабільнасці — Erasmus Mundus. Былі прадстаўленыя і паслугі, якія дапамагаюць беларускім навукоўцам зарыентавацца ў пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва, а таксама прыклады праектаў, выкананых з удзелам беларускіх і еўрапейскіх партнёраў, іх вынікі і карысць для супольнасці.

Так, Уладзімір Лабуноў, кіраўнік праекта 7РП BELERA Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, падрабязна распавёў пра супрацоўніцтва з ЕС у

***Аляксандр Жыгуліч, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:***
*«Мабыць, самае галоўнае заключаецца ў тым, што айчынная навука атрымлівае доступ да замежных рынкаў, на якіх мы можам гандляваць сваёй інтэлектуальнай уласнасцю і навукова-тэхнічнымі паслугамі ў тых галінах, дзе мы канкурэнтаздольныя».*

- Рамачныя праграмы – асноўны фінансавы інструмент Еўрасаюза для падтрымкі і развіцця навуковых даследаванняў і распрацовак у інтарэсах ЕС у цэлым або значнай часткі краін-сябраў.
- Рэалізуюцца з 1984 года пяцігадовымі цыкламі, з 2007-га цыкл стаў сямігадовым.
- Рашэнне аб зацвярджэнні праграмы прымаецца сумесна Еўрапарламентам і Еўрапейскім Саветам пры ўдзеле Еўрапейскай Камісіі.
- Распрацоўваюць і адміністуюць праграмы Еўрапейская Камісія, Генеральны дырэктарат па навуцы і інавацыях сумесна з галіновымі генеральнымі дырэктаратамі.
- Крыніца фінансавання – бюджэт Еўрапейскага Саюза.
- Пачатак 7РП – студзень 2007 года, заканчэнне — 2013 год.
- Бюджэт 7РП – 55 млрд. еўра (10—15% ад агульных выдаткаў на навуку ў ЕС).

## КРАІНЫ-ЎДЗЕЛЬНІЦЫ 7РП:

- **27 краін-сябраў Еўрапейскага Саюза;**
- **краіны – асацыяваныя ўдзельнікі 7РП —** Албанія, Ісландыя, Ізраіль, Ліхтэнштэйн, Македонія, Чарнагорыя, Нарвегія, Швейцарыя, Харватыя, Турцыя, Сербія, Малдова;
- **іншыя краіны, краіны-суседзі і краіны-партнёры** ў галіне міжнароднага супрацоўніцтва (Міжнароднае супрацоўніцтва краін-партнёраў), у тым ліку Беларусь .




## ТЭМАТЫЧНЫЯ НАПРАМКІ СУМЕСНЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У РАМКАХ 7РП:

- ахова здароўя;
- прадукты харчавання, сельская гаспадарка і біятэхналогіі;
- інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі;
- нананавукі, нанатэхналогіі, матэрыялы і новыя тэхналогіі вытворчасці;
- энергетыка;
- навакольнае асяроддзе (у тым ліку змены клімату);
- транспарт (у тым ліку аэранаўтыка);
- сацыяльна-эканамічныя і гуманітарныя навукі;
- бяспека;
- космас.

галіне распрацоўкі вугляродных нанатрубак і фатонікі.

### Плён супрацы

Выступіўшы ў пачатку семінара з прывітальным словам, кіраўнік Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майра Мора падкрэсліла, што навука — гэта тая сфера дзейнасці, дзе неабходнасць супрацоўніцтва Беларусі і ЕС дыктуецца агульнасцю задач — імкненнем да больш высокай эфектыўнасці энергетыкі і транспарту, да пераходу на аднаўляльныя крыніцы энергіі, да недапушчэння зменаў клімату, да больш высокага ўзроўню бяспекі прадуктаў харчавання і росту іх вытворчасці, да пераадолення хваробаў 21-га стагоддзя і г.д. У гэтым кантэксце рамачныя праграмы — прыдатны інструмент для сумеснага вырашэння агульных задач. Канкурэнцыя ў гэтых праграмах высокая, а ўдзел Беларусі пакуль невялікі. Аднак, канкурэнцыя аднолькава высокая для ўсіх удзельнікаў праграмы. І ЕС, і Беларусь толькі выйграюць, калі беларускія навукоўцы будуць удзельнічаць у праграмах міжнароднай мабільнасці і ўвойдуць у еўрапейскую навуковую прастору.

У сваю чаргу, Аляксандр Жыгуліч, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, адзначыў сістэмны характар намаганняў свайго ведамства па распаўсюджванні інфармацыі і садзейнічанні навуковай супольнасці краіны ў пытаннях удзелу ў 7 Рамачнай праграме навукова-тэхналагічнага развіцця Еўрапейскага Саюза і іншых агульнаеўрапейскіх праграмах. Спадар Жыгуліч паведаміў, што ўдзел у Рамачных праграмах Еўрапейскага Саюза дазваляе беларускім навукоўцам зрабіць свой унёсак у вырашэнне глабальных праблем і дае магчымасць Беларусі карыстацца вынікамі міжнародных намаганняў. Па стане на лістапад мінулага года больш за 30 беларускіх партнёраў удзельнічалі ў 26 праектах з агульным бюджэтам для беларускага боку ў аб'ёме 1,84 мільёна еўра. *«Пры гэтым беларускія навукоўцы ў рамках рэалізаваных праектаў маюць доступ да ведаў коштам у 152,4 мільёна еўра, гэта значыць, да ведаў, якія каштуюць у 90 разоў больш, чым іх уласны ўнёсак».*

Аляксандр Жыгуліч таксама адзначыў, што міжнародная мабільнасць — не самамэта. Праектна-арыентаваная міжнародная мабільнасць — гэта сродак для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва, а міжнароднае супрацоўніцтва, у сваю чаргу, — інструмент для павышэння ўзроўню навукі і развіцця інавацыйнай дзейнасці. Міжнароднае супрацоўніцтва дае доступ беларускім навукоўцам як да навуковай інфраструктуры, так і да замежных крыніц фінансавання. Так, у 2010 годзе гэтыя крыніцы склалі каля 14% ад агульных выдаткаў на навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія працы.

### 36 беларускіх праектаў

Як адзначыла ў сваім выступе Вольга Меероўская, прадстаўнік Нацыянальнага інфармацыйнага офіса 7-й Рамачнай праграмы навукова-тэхналагічнага развіцця ЕС (БелІСА), беларускім навукоўцам прадастаўленыя паслугі, якія дапамогуць ім наладзіць эфектыўнае міжнароднае супрацоўніцтва па развіцці ідэй і тэхналогій. Вольга Меероўская на брыфінгу паведаміла журналістам, што *«на семінар прыехала 240 удзельнікаў, хоць чакалася 150 чалавек. Людзі прыехалі з розных рэгіёнаў краіны. Самыя актыўныя — маладыя навукоўцы з Гродзенскай вобласці — іх прыкладна дваццаць*





З матэрыяламі семінара можна азнаёміцца на вэб-старонцы Беларускага інстытута сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (ДУ «БелІСА»): **http://belisa.org.by/ru/actions/conference/sem27_09_12.html**



*адсоткаў ад агульнай колькасці прысутных у зале».*

Таксама спадарыня Меероўская адзначыла, што найбольш прывабнай сферай дзейнасці для беларускіх навукоўцаў сталі інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі. *«Гэта звязана з тым, што гэтая галіна навукі ў Беларусі досыць добра развітая. Да таго ж беларускія навукоўцы, якія развіваюць гэтую сферу, маюць вагу ў еўрапейскіх навуковых колах»,* — дадала яна.

Бюджэт праграмы 7РП на 2007-2013 гады вызначаны ў памеры 55 млрд. еўра. На сярэдзіну лета праграмай ўжо падтрымана 19 тыс. праектаў з удзелам больш як 79 тыс. арганізацый з Еўрапейскага Саюза ды іншых краін свету, агульнай колькасцю больш за 100. Беларусь — адна з іх. На дадзены момант падтрымана 36 праектаў з удзелам беларускіх каманд.

**Больш на http://cordis.europa.eu/fp7/home_en.html**

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ФІНАНСАВАННЯ ПРАЕКТАЎ У 7РП

- **Падтрымліваецца навукова-даследчая і канстуктарская праца**, у тым ліку распрацоўка доследнага ўзору і яго тэставанне.
- **Фінансуюцца праекты:**
  - з удзелам некалькіх еўрапейскіх краін. Як правіла, тры партнёры з трох розных краін ЕС і асацыяваных краін-удзельніц;
  - толькі з міждысцыплінарнай і міжгаліновай тэматыкамі;
  - выбраныя на конкурснай аснове.
- **У фінансаванні праектаў** удзельнічаюць не толькі Еўракамісія, але і партнёры.
- **Усе раздзелы і тэмы адкрытыя для трэціх краін**, партнёры з Міжнароднага супрацоўніцтва краін-партнёраў фінансуюцца Еўракамісіяй на тых жа ўмовах, што партнёры з краін ЕС і асацыяваных краін-удзельніц.